**Леановіч З.Л.,**
дацэнт

# РАЗВІЦЦЁ ВОБРАЗНАГА МЫСЛЕННЯ СТУДЭНТАЎ НА ЗАНЯТКАХ ПА ДЫРЫЖЫРАВАННЮ

Адным з важных бакоў комплекснага выхавання харавога дзеяча ў працэсе заняткаў па дырыжыраванню з'яўляецца развіццё вобразнага мыслення і тэмбравага слыху.

Асновай вобразнага мыслення служаць успрыманне дырыжора, яго ўяўленне. Яны ствараюцца ў працэсе складанага аналізу, супастаўлення і звязаны з дэталёвым бачаннем. Уяўленне ёсць форма псіхічнай дзейнасці чалавека, якая канкрэтызуе веды.

Вядома таксама, што ўяўленні ўздзейнічаюць на станаўленне і ўспрыманне мастацкіх вобразаў музычных твораў. Уяўленні звязаны з правільным разуменнем паняццяў «мастацкі вобраз», «вобразнае мысленне», «вобразнае адлюстраванне», «вобраз».

Асацыятыўныя ўяўленні студэнта, якія не падтрымліваюцца ўсведамленнем і канкрэтнымі ведамі, могуць так і застацца цьмянымі імпульсамі.

Выхаванне вобразнага мыслення немагчыма без развіцця ў студэнта таксама творчай фантазіі. Вядома, што толькі розум, які надзелены фантазіяй, можа тварыць. Пры яго ўдзеле працякае ўся творчая праца над пераўтварэннем нотных знакаў партытуры ў выразнае, ўсвядомленае, дзейснае выкананне.

Для развіцця ўяўлення студэнту патрабуецца асяроддзе, якое багата імпульсамі і стымуламі. Ў гэтым выпадку ён развіваецца ўсебакова. Развіццю ўяўлення садзейнічаюць чытанне мастацкай літаратуры, прагляд тэлеперадач, наведванне выстаў, карцінных галерэй, музеяў, паездкі ў розныя гарады.

Развіццё ўяўлення ў сваю чаргу абвастрае эмацыянальнае ўспрыманне вобразаў і садзейнічае развіццю інтэлекту студэнта.

Эмацыянальнае выхаванне – складаны працэс, які ствараецца ўсім сацыяльным бытам. Вельмі часта эмацыянальная неразвітасць студэнта ёсць вынік уздзеяння знешніх фактараў - сям'і, асяроддзя, якія дыктуюць менавіта такое развіццё асобы.

Разглядаючы праблему развіцця вобразнага слыху, трэба памятаць аб агульнай тэндэнцыі ўскладнення свабоднага вакальна-харавога выкладу, тэмбравай мовы ў сучаснай музыцы. Паяўляюцца ўсё новыя прыёмы харавога выканальніцтва, ўсё новыя тэмбры. Гэта, безумоўна, ускладняе праблему выхавання тэмбра-вобразнага слыху. Складанасць задачы ў тым, каб знайсці правільныя суадносіны розных відаў працы для развіцця кожнай з музычных здольнасцей. Пры вывучэнні гэтага пытання выяўляецца найбольшая ўзаемасувязь паміж тэмбравым, вакальным, гарманічным і ўнутраным слуханнем. Высокая культура музычнага слыху прадугледжвае магчымасць успрымаць і аналізаваць вобразны змест, стылёвыя і жанравыя прыметы твора. Высокаразвіты слых дазваляе свабодна разбірацца ў любой фактуры, адрозніваць вакальна-харавыя і аркестравыя тэмбры, беспамылкова вызначаць любыя інтэрвалы, акорды.

Выхаванне вобразна-тэмбравага слыху немагчыма без метадычна правільна пабудаваных заняткаў па сальфеджыо, гармоніі, пастаноўцы голасу, аранжыроўцы, харазнаўству.

Асаблівае месца займаюць харавы клас і дырыжыраванне, дзе студэнт можа практычна фарміраваць патрэбныя навыкі. Уся канцэртная і практычная дзейнасць хору павінна спрыяць выпрацоўцы ў студэнта ўяўлення аб канкрэтнай харавой гучнасці, фарміраванню ідэала харавога гучання. У музыцы ёсць усё, важна яе толькі пачуць, разгадаць яе змест сваім чулым і гібкім ўяўленнем, выхаванню якога і павінна ўдзяляцца вялікая ўвага на занятках па дырыжыраванню.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ